Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (88), 2015

*УДК 94:327(47+57+438)"1925"*

# Візіт наркама замежных спраў СССР Г.В. Чычэрына ў Варшаву восенню 1925 г.

М.М. Мязга

Выяўляюцца прычыны, рэканструкцыі ходу і аналізу наступстваў візіта наркама замежных спраў СССР Г. Чычэрына ў Варшаву ў верасні 1925 г. Абгрнутоўваецца гіпотэза, згодна з якой візіт не быў сведчаннем і вынікам паляпшэння польска-савецкіх адносін. Ён уяўляў сабой рэакцыю на неспрыяльныя змены для СССР і Польшчы ў міжнароднай сітуацыі, і павінен быў стаць, як разлічвалі ўрады дзвюх краін, інструментам ціску на іх знешнепалітычных партнёраў. Тым самым Масква і Варшава спадзяваліся больш паспяхова абараніць свае дзяржаўныя інтарэсы ва ўмовах падрыхтоўкі Гарантыйнага пакта.
**Ключавыя словы:** савецка-польскія адносіны, візіт, Г. Чычэрын, А. Скшыньскі, Гарантыйны пакт, перамовы, Германія.

The causes of the visit of People's Commissar for Foreign Affairs of the USSR Georgy Chicherin to Warsaw in September in 1925, course of the visit, and analysis of the visit's consequences are discussed. The foundation for the hypothesis that the visit could not be considered as a result of improvement of Polish-Soviet relationship is provided. It was a reaction based on the unfavorable changes for Poland and USSR in the international situation, so, as it was expected in both countries, the visit had to be used as leverage against foreign political partners. Thus, Moscow and Warsaw were hoping to successfully defend their national interests during preparation of the Rhineland Pact.
**Keywords:** Soviet-Polish relationship, visit, Georgy Chicherin, Aleksander Skrzyński, Rhineland Pact, negotiations, Germany.

Савецка-польскія адносіны 1920-х гг. вызначаліся складанасцю, наяўнасцю вострых супярэчнасцей. Пры гэтым у іх назіраліся значныя перапады, і часам намячалася тэндэнцыя да паляпшэння. Асабліва прыкметнай яна стала ва ўмовах перамоў па падрыхтоўцы Рэйнскага пакта ў 1925 г. Адной з найбольш яскравых праяў пацяплення ў савецка-польскіх адносінах стаў візіт у Варшаву ў верасні 1925 г. наркама замежных спраў СССР Г. В. Чычэрына. У дадзеным артыкуле зроблена спроба высветліць матывы, якімі кіраваліся ўрады дзвюх краін пры арганізацыі гэтага візіта, рэканструяваць яго ход, устанавіць наступствы візіта для міжнародных адносін.

У Варшаве міжнародную сітуацыю, якая склалася ў 1925 г. у сувязі з падрыхтоўкай Рэйнскага пакта, ацэньвалі як дастаткова складаную для Польшчы. У мемарандуме польскага МЗС у сувязі з гэтым адзначалася ўзмацненне агрэсіўных тэндэнцый у міжнародных адносінах, што звязвалася з палітыкай Германіі і СССР. У першай узмацнялася імкненне да рэвізіі вынікаў Першай сусветнай вайны. Другі імкнуўся, як гаварылася ў мемарандуме, «да агульнага грамадскага пераваротy ў інтарэсах свайго ўласнага імперыялізму». Пры гэтым адзначалася, што антыпольская палітыка Германіі раўназначна цеснаму германа-расійскаму супрацоўніцтву, і калі Гарантыйны пакт пакіне свабоду рук Германіі ў справе рэвізіі яе ўсходняй мяжы, то штурхне яе ў абдымкі Савецкай Pacii. Пры гэтым выказвалася надзея, што несумяшчальнасць Гарантыйнага пакта і Рапальскага дагавора прывядзе да разрыву цеснага супрацоўніцтва СССР і Германіі. Вырашэнню гэтай задачы надавалася асаблівае значэнне [1, s. 335–339].

Пагаршэнне знешнепалітычнага становішча Польшчы і імкненне ўнесці дадатковыя разнагалоссі ў савецка-германскія адносіны, падштурхнула яе ўрад да дэманстрацыі некаторага паляпшэння адносін з СССР. Гэта праявілася, у прыватнасці, у жаданні арганізаваць візіт у польскую сталіцу савецкага наркама замежных спраў. Паўпрад у Варшаве П. Войкаў яшчэ 22 мая паведамляў у Маскву, што польскі міністр замежных спраў А. Скшыньскі ў гутарцы з ім выказаў думку аб асабістай сустрэчы з Чычэрыным [2, л. 202]. Стан адносін паміж Масквой і Берлінам у той час даваў польскай дыпламатыі спадзяванні на тое, што названая прапанова будзе прынята. У маі 1925 г. у прамове на з’ездзе саветаў СССР Г. Чычэрын гава-

рыў, што ўступленне Германіі ў Лігу нацый азначае канец Рапала [3, s. 12]. 2 чэрвеня савецкі наркам замежных спраў накіраваў мемарандум германскаму міністру замежных спраў, у якім адзначаў, што ўступленне Германіі ў Лігу нацый без СССР азначала б яе далучэнне да «варожай нам групоўкі... Гэта канец Рапальскай сістэмы» [4, с. 237]. У чэрвені пад час візіту ў Берлін намесніка наркама замежных спраў М. Літвінава не ўдалося дабіцца адмовы Германіі ад падпісання Гарантыйнага пакта і ўступлення ў Лігу нацый [5, s. 516]. Пацярпеўшы няўдачу, М. Літвінаў 13 чэрвеня ў гутарцы з міністрам замежных спраў Г. Штрэзаманам даў зразумець, што ў гэтай сітуацыі СССР можа пайсці на збліжэнне з Польшчай і Францыяй [6, s. 95]. 19 ліпеня савецкі друк апублікаваў заяву кіраўніка савецкай дэлегацыі на гандлёвых перамовах з Германіяй Я. Ганецкага. Ён выказаў меркаванне, што ў кіруючых колах Германіі існуе моцнае супрацьдзеянне дагавору з СССР, адбываецца зацягванне перамоў [7]. Г. Штрэзаман у сваіх мемуарах адзначаў, што з чэрвеня 1925 г. савецка-германскія адносіны перажывалі памрачэнне [5, s. 519]. У той жа час у Берліне было заўважана некаторае пацяпленне ў польска-савецкіх адносінах. Г. Штрэзаман пасля гэтага прадпісаў германскай дэлегацыі на гандлёвых перамовах у Маскве заставацца на месцы, каб, «улічваючы палітычныя меркаванні, заключыць з рускімі які б то ні было дагавор» [8, с. 137]. Адмову германскай дэлегацыі ад тактыкі зацягвання перамоў заўважыў пасол Польшчы ў Маскве Кентжыньскі і паведаміў у МЗС сваёй краіны 16 жніўня, што савецка-германскі дагавор павінен быць падпісаны ў бліжэйшы час [9, ł. 171].

У Варшаве ў такой сітуацыі была адноўлена ідэя арганізаваць сустрэчу польскага і савецкага міністраў замежных спраў. Гэта звязана і з няўдачамі польскай дыпламатыі на заходнім напрамку. У сярэдзіне жніўня сарваўся візіт А. Скшыньскага ў Лондан, бо, па словах П. Войкава, «ніякага распалажэння да таго, каб бачыць Скшыньскага, у Чэмберлена не маецца». А перамовы польскага міністра замежных спраў у Парыжы не прынеслі жаданага выніку. Францыя адмовілася ад далейшай падтрымкі Польшчы па пытанні аб заключэнні Гарантыйнага пакта [10, лл. 1, 11]. 4 верасня П. Войкаў, паведамляючы Г. Чычэрыну аб імкненні палякаў арганізаваць візіт савецкага наркама ў Варшаву, звязаў гэты крок польскай дыпламатыі з жаданнем прадэманстраваць збліжэнне з СССР напярэдадні сесіі Лігі нацый і разглядаў яго як тактычны ход [10, л. 32]. Савецкая прэса ў гэты час шмат пісала аб тым, што ў Жэневе, дзе ідуць перамовы аб Гарантыйным пакце, А. Скшыньскі разгарнуў актыўную дзейнасць, каб дабіцца гарантый для ўсходніх граніц Германіі [11].

У Маскве на гэты раз польская ініцыятыва аб візіце наркама замежных спраў была сустрэта станоўча. У многім гэта звязана са станам савецка-германскіх адносін на той момант. У канцы жніўня – пачатку верасня палітбюро на двух пасяджэннях абмяркоўвала пытанне аб гандлёвых перамовах з Германіяй. 27 жніўня было прынята рашэнне пайсці на саступкі Германіі пры падрыхтоўцы дагавора. 3 верасня палітбюро палічыла мэтазгодным з удзелам М. Літвінава арганізаваць сустрэчу савецкай і германскай дэлегацый на гандлёвых перагаворах, таксама даручыць яму пагутарыць з паслом Германіі У. Брокдорф-Ранцау і пацвердзіць гатоўнасць савецкага ўрада пайсці на саступкі пры падрыхтоўцы гандлёвага дагавора [12, с. 91–92]. Акрамя імкнення інтэнсіфікаваць перамовы з Германіяй праз пэўныя саступкі, больш актыўнае абмеркаванне спрэчных пытанняў, савецкае кіраўніцтва лічыла мэтазгодным паўплываць на пазіцыю германскага ўрада пагрозай збліжэння з Польшчай. У лісце ад 6 верасня на імя М. Літвінава Г. Чычэрын выказаў меркаванне, што такая дэманстрацыя савецка-польскага збліжэння «можа напалохаць Германію і зрабіць яе больш пакладзістай» [13, л. 7]. Імкненне аказаць ціск на Германію як матыў свайго візіту ў Варшаву Г. Чычэрын прыводзіць і ў тэлеграме, якую накіраваў 7 верасня ў Варшаву П. Войкаву. Ён пісаў, што мог бы паехаць у Берлін і праз Рыгу, але гэта «зробіць уражанне абыходу Варшавы і будзе прадстаўлена як прыкмета ахаладжэння адносін паміж нашымі ўрадамі. Наўрад ці гэта пажадана» [14, л. 112]. Такім чынам, савецкі наркам не хацеў, каб склалася ўражанне аб пахаладанні ў польска-савецкіх адносінах. Наадварот, неабходна было з дапамогай візіта прадэманстраваць іх высокі ўзровень, што Германіяй заўсёды ўспрымалася як непажаданы факт.

10 верасня ў «Известиях» быў надрукаваны перадавы артыкул, прысвечаны савецка-польскім адносінам. У ім адзначалася імкненне Варшавы ў апошні час да паляпшэння адносін з СССР. Звязвалася гэта з падрыхтоўкай Гарантыйнага дагавора і імкненнем Англіі за-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

даволіць Германію за кошт Польшчы [15]. Названую публікацыю можна разглядаць як сігнал для палякаў, што Г. Чычэрын гатовы нанесці візіт у Варшаву. 14 верасня адбылася гутарка М. Літвініва з давераным у справах Польшчы ў СССР Зелязінскім. Апошні актыўна выказаўся за прыезд Г. Чычэрына ў польскую сталіцу і паведаміў, што ён можа адбыцца ўжо 19–20 верасня, калі А. Скшыньскі вернецца з Жэневы ў Варшаву [16, л. 54]. У той жа дзень на імя Г. Чычэрына была атрымана з Варшавы тэлеграма П. Войкава. Ён адзначаў імкненне палякаў да таго, каб у бліжэйшы час візіт Г. Чычэрына ў Варшаву адбыўся. Больш за тое, палякі вядуць гаворку і аб магчымым візіце ў адказ А. Скшыньскага ў Маскву. Такое актыўнае імкненне Польшчы прадэманстраваць збліжэнне з СССР П. Войкаў звязваў не з іх рэальным жаданнем палепшыць савецка-польскія адносіны, а з вынікамі перамоў у Жэневе [17, с. 531]. Улічваючы вялікую зацікаўленасць польскага ўрада ў прыездзе Г. Чычэрына ў Варшаву, савецкая дыпламатыя стала адцягваць гэты візіт, тым самым паказваючы, што ён патрэбны, перш за ўсё, польскаму ўраду. 18 верасня П. Войкаў праінфармаваў наркама замежных спраў, што палякі вельмі балюча адрэагавалі на адтэрміноўку візіту [10, л. 36]. 25 верасня ён зноў тэлеграфаваў у Маскву, што польскі ўрад усяляк раздувае значэнне візіта Г. Чычэрына і імкнецца не толькі надаць яму характар транзітнага праезду праз Варшаву і не проста візіта міністра замежных спраў СССР, але хацеў бы «бачыць у прыездзе Чычэрына прапанову палякам нейкага блока з намі». Войкаў адзначае вымушаны характар такіх крокаў з боку Польшчы і падкрэслівае, што палітычная і эканамічная ізаляцыя Польшчы штурхае яе да Савецкай Расіі. Гэта прызнае нават лагер Ю. Пілсудскага [10, лл. 47, 49, 59].

Такім чынам, савецкае кіраўніцтва расцаніла запрашэнне Г. Чычэрына ў Варшаву як чыста тактычны ход з боку польскай дыпламатыі. Але публічна савецкі ўрад падкрэсліваў значэнне візіту як факта, які дэманструе паляпшэнне польска-савецкіх адносін. К. Радэк у адным з артыкулаў у савецкай прэсе напярэдадні прыезда ў Варшаву Г. Чычэрына адзначаў, што ў апошні час у палітыцы кіруючых колаў Польшчы намячаецца імкненне да збліжэння з СССР, і савецкае кіраўніцтва можа толькі вітаць такія змены [18]. Савецкі ўрад, з аднаго боку, хацеў прыездам Чычэрына ў Варшаву аказаць ціск на Германію, але, з другога боку, непакоіўся, каб дэманстрацыя збліжэння з Польшчай не паўплывала празмерна адмоўна на савецка-германскія адносіны. 24 верасня ў «Известиях» быў надрукаваны перадавы артыкул, прысвечаны савецка-германскім адносінам. У ім адзначалася, што рапальская лінія церпіць сур'ёзныя змены ў сувязі з перамовамі аб Гарантыйным пакце і запланаваным уступленнем Германіі ў Лігу нацый. Але адначасова падкрэслівалася, што ўжо закончана праца над гандлёвым дагаворам і яго «падпісанне паівінна стаць фактам, які пацвердзіць нязменнасць рапальскай палітыкі» [19]. Гэты артыкул адлюстроўваў афіцыйную пазіцыю савецкай дзяржавы, і яго з'яўленне напярэдадні візіту Г. Чычэрына ў Варшаву не было выпадковым. Ён даваў зразумець Германіі, што, нягледзечы на гэты візіт, захаванне сяброўскіх адносін паміж СССР і Германіяй магчыма і рэальнай дэманстрацыяй гэтага стане падпісанне гандлёвага дагавора.

Польскі ўрад разлічваў прыездам Чычэрына аказаць ціск як на Германію, так і на краіны Захаду, каб прымусіць іх больш лічыцца з польскімі інтарэсамі. Адна з галоўных польскіх газет «Кур'ер Варшаўскі» адзначала, што ў сувязі з падрыхтоўкай Рэйнскага пакта Польшча ўжо ізалявана і ніколі да гэтага часу яе становішча не было такім сур'ёзным. У сувязі з гэтым газета наступным чынам ацэньвала значэнне візіта Г. Чычэрына: «Адзіным светлым праблескам на змрочным гарызонце польскай знешняй палітыкі з'яўляецца прыезд Чычэрына. Аднак не варта думаць, што збліжэнне паміж СССР і Польшчай надыдзе адразу» [18]. Другая буйная польская газета «Варшавянка» адзначала: «Візіт Чычэрына ў Варшаву сведчыць, што з боку Расіі Польшчы пагражае меншая небяспека, чым з боку Германіі». Указвалася, што візіт ёсць адлюстраванне наступіўшага ў адносінах паміж дзвюма краінамі павароту спраў да лепшага [20, ss. 362, 365].

У сувязі з пералічанымі абставінамі Г. Чычэрыну, які прыбыў у Варшаву 28 верасня, быў аказаны самы цёплы прыём. У ходзе перамоў міністраў замежных спраў дзвюх краін адбыўся абмен думкамі па праблеме заключэння Гарантыйнага пакта. Чычэрын указваў пры гэтым на факт адмовы Германіі гарантаваць польскую граніцу і ўзнікшую ў сувязі з гэтым пагрозу для Польшчы. Ён адзначыў, што польская палітыка варожая СССР на двух асноўных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

накірунках: 1) імкненне стварыць балтыйкі саюз; 2) наяўнасць польска-румынскага саюза. Савецкі наркам паўтарыў прапанову заключыць дагавор аб ненападзе і няўдзеле ў варожых кааліцыях. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў СССР ёсць прастора для манёўра, бо існуе магчымасць англа-германскага зблiжэння і франка-польскі саюз. Абодва гэтыя блокі, паводле яго слоў, будуць запрашаць да сябе СССР [21, сс. 416, 418].

Пасля завяршэння візіту Г. Чычэрына ў Варшаву польскія палітыкі і прэса працягвалі падкрэсліваць яго значэнне. Як адзначаў П. Войкаў у тэлеграме ў Маскву 2 кастрычніка, «гэта было ім неабходна для дэманстрацыі перад Англіяй, гэтак жа як і перад Германіяй» [21, с. 420]. 8 кастрычніка ў сеймавай камісіі па замежных справах выступіў прэм'ер-міністр У. Грабскі. Ён ахарактарызаваў візіт Г. Чычэрына як факт, які сведчыць аб паляпшэнні польска-савецкіх адносін. Паводле яго слоў, гэтыя адносіны складваюцца ўсё больш і больш спрыяльна, і візіт Г. Чычэрына даказаў, які прагрэс дасягнуты ў справе аслаблення напружанасці паміж Масквой і Варшавай. Гэта было імкненне выкарыстаць візіт Чычэрына для ціску на Захад напярэдадні Лакарнскай канферэнцыі. Не выпадкова ў прамове Грабскага прагучаў і тэзіс аб неабходнасці для Польшчы дабівацца поўнай гарантыі сваіх граніц [22].

Прыезд Г. Чычэрына ў Варшаву выклікаў хваляванне ў Берліне. У германскай прэсе быў апублікаваны артыкул Г. Штрэзамана, прысвечаны савецка-польскай сустрэчы. Германскі міністр замежных спраў адзначаў, што візіт Чычэрына ў Варшаву ў той час, калі Германія рыхтуецца да ўдзелу ў Лакарнскай канферэнцыі, не з'уяляецца выпадковасцю, і выказаў шкадаванне, што Масква і Берлін займаюць супрацьлеглыя пазіцыі па пытанні аб неабходнасці ўступлення Германіі ў Лігу нацый і падпісання Гарантыйнага пакта [5, s. 515]. Начальнік усходняга аддзела германскага МЗС Г. Дзірксан у сваіх мемуарах пісаў потым, што знаходжанне Г. Чычэрына ў Варшаве на шляху ў Берлін было жэстам, які нагадваў шантаж [23, с. 87].

Услед за Варшавай, Г. Чычэрын прыбыў 30 верасня ў Берлін. Трэба прызнаць, што варшаўская сустрэча зрабіла на германскі ўрад пажаданае для Масквы ўражанне. Г. Штрэзаман у гутарцы з Г. Чычэрыным 1 кастрычніка заявіў аб прынцыповай згодзе Германіі заключыць палітычны дагавор з СССР, а ў бліжэйшы час падпісаць гандлёвы дагавор [12, с. 93]. 7 кастрычніка Г. Чычэрына прыняў прэзідэнт П. Гіндэнбург і паведаміў, што ён упаўнаважыў пасла ў Маскве У. Брокдорф-Ранцау падпісаць гандлёвы дагавор з СССР [22]. Не была абмінута на перамовах і польская праблема. Г. Чычэрын у чарговы раз выказаў апасенне, што падпісанне Германіяй Гарантыйнага пакта прывядзе да якога-небудзь, хай нават ускоснага, пацвярджэння германа-польскай граніцы. На гэта Г. Штрэзаман адказаў, што Германія ніколі не пойдзе добраахвотна на прадастаўленне гарантый Польшчы [5, s. 515]. Як бачым, Маскву ў сувязі з падрыхтоўкай Гарантыйнага пакта палохала не толькі збліжэнне Германіі з Захадам, але і магчымасць прадастаўлення ёю гарантый польскай заходняй граніцы, чым ў значнай ступені быў бы аслаблены нефармальны савецка-германскі саюз, які ў многім меў антыпольскую аснову. На тое, каб развеяць гэтыя апасенні, быў накіраваны і мемарандум Г. Штрэзамана савецкаму паўпраду ў Берліне ад 10 кастрычніка. У ім указвалася, у прыватнасці, што аб гарантыі ўсходняй граніцы Германіі ў праекце Гарантыйнага пакта няма і мовы [5, s. 512].

Такім чынам, візіт Г. Чычэрына ў Варшаву ў канцы верасня 1925 г. быў абумоўлены не столькі развіццём двухбаковых польска-савецкіх адносін, колькі склаўшайся міжнароднай сітуацыяй. Яна мянялася ў неспрыяльны бок як для СССР, так і для Польшчы. Адбывалася аслабленне сувязей абедзвюх краін з традыцыйнымі саюзнікамі. У такой сітуацыі прыезд савецкага наркама замежных спраў у Польшчу стаў для яе кірубчых колаў сродкам ціску на Захад, каб прымусіць яго ў большай ступені ўлічваць яе інтарэсы пры падрыхтоўцы Гарантыйнага пакта. СССР спадзяваўся, што гэтая дэманстрацыя польска-савецкага збліжэння стане адным з фактараў, які прымусіць Германію захаваць рапальскую палітыку.

## Літаратура

1. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej 1918–1938 : w 2 t. – Warszawa : Inst. Wyd. Pax., 1989. – T. 1. – 540 s.

2. Архив внешней политики Российской Федерации (АВП РФ). – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 217. – Д. 52667.

3. Grosfeld, L. Polska a stosunki niemiecko-sowieckie. 1918–1939 / L. Grosfeld – Warszawa : Niezależna Oflcyna Wydawnicza, 1988. – 43 s.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. Советско-германские отношения 1922–1925. Документы и материалы : в 2 ч. – М. : Политиздат, 1977. – Ч. 1. – 408 с.
5. Streseman, G. Vermachtnis / G. Streseman : in 3 b. B. 2. – Berlin : Ullstein von Henri Bernhard, 1932. – 611 s.
6. Kaminski, M. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej. 1918–1939 / M. Kaminski. – Warszawa : Mlodziezowe Agencja Wydawnicza, 1987. – 120 s.
7. Известия. 1925. 19 июля. №163 (2496).
8. Никонова, С.В. Очерки европейской политики Германии в 1924–1929 годах / С.В. Никонова. – М. : Наука, 1977. – 373 с.
9. Archiw Akt Nowych. MSZ. Sygn. 6635.
10. АВП РФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 217. – Д. 52668.
11. Известия. – 1925. – 12 сентября. – № 208 (2541).
12. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Европа. Решения особой папки 1923–1939. – М. : РОССПЭН, 2001. – 400 с.
13. АВП РФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 217. – Д. 52673.
14. АВП РФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 217. – Д. 52670.
15. Известия. – 1925. – 10 сентября. – № 206 (2539).
16. АВП РФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 217. – Д. 52672.
17. Документы внешней политики СССР : в 22 т. – М. : Издат. Политической литературы, 1965. – Т. 7. – 760 с.
18. Известия. – 1925. – 27 сентября. – № 221 (2554).
19. Известия. – 1925. – 26 сентября. – № 220 (2553).
20. Stroński, S. Pierwsze lat dziesięć (1918–1928) / S. Stroński. – Lwów – Warszawa : Gabrynowicz i syn, 1928. – 627 s.
21. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14 т. – М. : Наука, 1966. – Т 4. – 559 с.
22. Известия. – 1925. – 9 октября. – № 231 (2564).
23. Дирксен, Г. Москва, Токио, Лондон. Двадцать лет германской внешней политики / Г. Дирксен. – М. : «ОЛМА-ПРЕСС», 2001. – 446 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 06.01.2015

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ